***Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (БДУ).***

Заснаваны ў Мінску 11.7. 1921, адкрыты 30.10.1921. Выдае навуковы часопіс *«Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта»* (з 1969). У 1994 утворана вучэбна-метадычная секцыя па фальклоры (кіраўнік Р.М Кавалёва), якая выдала «Метадычныя ўказанні: ілюстрацыйныя матэрыялы да правядзення фальклорнай практыкі» (вып. 1–5,1997–2002), зборнікі артыкулаў «Усходнеславянскі фальклор» (2000), «Свет славянскага фальклору» (2001), «На хвалях філалогіі» (2002), «Фалькларыстычныя даследаванні: Кантэкст. Тыпалогія. Сувязь» (2004) і інш. Ва універсітэце праводзяцца Шырмаўскія чытанні, на якіх асвятляюцца шырокія праблемы фалькларыстыкі. Фалькларыстычная праца на філалагічным факультэце падрыхтавала адкрыццё ў ім у 1982 групы, а ў 1985 – Навукова-даследчай лабараторыі беларускага фальклору Беларускага дзяржаўнага універсітэта як каардынацыйнага цэнтра збірання, вывучэння фальклору.

У лабараторыі атрымала сваё развіццё фалькларыстычная навуковая школа, якая адлічвае пачатак з 1970 года. У розныя гады ў НДЛ беларускага фальклору і дыялекталогіі распрацоўваліся ўсе асноўныя напрамкі школы: лакальна-рэгіянальнае вывучэнне нацыянальнага фальклору (тэарэтычную аснову заклалі кандыдаты філалагічных навук, дацэнты *Вера* ***Захарава****, Рыма* ***Кавалёва****, Васіль* ***Ліцьвінка***); адукацыйна-культуралагічная інтэрпрэтацыя фальклору як асновы этнічнай і традыцыйнай культуры народа (актыўна рапрацоўваў кандыдат філалагічных навук Васіль Ліцьвінка); этналінгвістыка (тэарэтычны падмурак закладзены кандыдатам філалагічных навук, дацэнтам Мікалаем Антропавым); сацыяфалькларыстыка (тэарэтычную аснову распрацавалі кандыдаты філалагічных навук, дацэнты Р.М. Кавалёва, Т.А. Марозава ў 2000-я гг.);

Выбранае:

Ковалева Р.М. Именная интеграция мифологического в пространство народного календаря и календарной обрядности / Римма Ковалева // Фалькларыстычныя даследаванні : Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зборнік артыкулаў. – Мінск. – 2014. – Вып. 10. – С. 48–56

Кавалёва Р.М. Сфера купальскай прозы / Рыма Кавалёва // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : (памяці антраполага Зінаіды Мажэйкі) : зборнік навуковых прац [удзельнікаў X Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 29 красавіка – 1 мая 2016 г., г. Мінск / рэдкалегія: В. Р. Языковіч (старшыня) і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 91–93

Ковалева Р. М. Мифоритуальная и эстетическая целостность основной песни "Стрелы" / Ковалева Р. М. // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : [зборнік артыкулаў] / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Дзяржаўная навуковая ўстанова "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры", філіял "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы". – 2017. – Вып. 22. – С. 324–330

Ковалева Р. М. К вопросу о генезисе и генеалогии "Стрелы" / Ковалева Р. М. // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : [зборнік артыкулаў] / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Дзяржаўная навуковая

ўстанова "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры", філіял "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы". – 2017. – Вып. 23. – С. 215–222

Ковалева Р. М. Прозаический дискурс "Стрелы" как особый род текста в антропологической перспективе и ретроспективе / Ковалева Р. М. // Зборнік дакладаў і тэзісаў VIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў" (Мінск, Беларусь, 7–8 верасня 2017 года) / [рэдкалегія: А. І. Лакотка (галоўны рэдактар) і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 518–522

Ковалева Р. М. Белорусская Масленица в отношении к карнавалу / Римма Ковалева // Фальклarыстычныя даследаванні : Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зборнік артыкулаў. – Мінск. – 2022. – Вып. 16. – С. 68–76

Кавалёва Р. М. Беларускія куставыя песні: кантэкст, тыпалогія, сувязі / Кавалёва Р. М. // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск. – 2022. – Вып. 3. – С. 611–615.

***Марозава*** *(дзявочае Івахненка) Таццяна Анатолеўна* (н. 13.10.1975, в. Холмеч Рэчыцкага р-на), фалькларыстка. Кандыдат філалагічных навук (2001). Скончыла БДУ (1997), з 2000 выкладае ў ім. Даследуе каляндарна-абрадавы фальклор беларусаў ва ўсходнеславянскім кантэксце, тэарэтычныя праблемы фалыслору. Аўтар манаграфіі «Паэтыка беларускіх абрадавых песень перыядаў каляндарных пераходаў» (2002) – першага ў галіне гістарычнай паэтыкі комплекснага аналізу асаблівасцей станаўлення тропаў, вобразаў і кампазіцыйнай арганізацыі масленічных, траецкіх, куставых, русальных вусна-паэтычных твораў. У артыкулах «Семантыка вобраза русалкі» (1995), «Беларуская русалка і роднасныя міфалагічныя персанажы» (2000), «Масленка, Бяроза, Куст, Русалка: узроўні асацыятыўна-семантычных сувязей» (2002) і інш. даследуе вобраз русалкі ў бел. фальклоры і яго адпаведнікаў у міфалагічных уяўленнях інш. народаў свету.

Выбранае:

Івахненка Т.А. Беларуская русальная абраднасць: праблемы вывучэння / Т.А. івахненка // Весн. БДУ. – Сер. 4. – 1999. – № 1;

Марозава Т.А. Семантыка цэнтральных вобразаў абрадавых песень перыядаў каляндарных пераходаў / Т. А. Марозава // Роднае слова. – 2003. – №10.

***Раговіч*** *Уладзімір*

Выбранае:

Раговіч У. І. Песенны фальклор Палесся: У 3 т. Т.1. Песні святочнага календара. Мінск: Чатыры чвэрці, 2001. 527 с.

***Казакова*** *Ірына*

Выбранае:

Казакова І. В. Спецыфіка беларускага каляндарна-абрадавага фальклору / Казакова І. В. // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : матэрыялы IX міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Мінск, 15–17 кастрычніка

2009 г. : у 2 ч. / пад рэдакцыяй В. П. Рагойшы. – Мінск, 2010. – Ч. 1. – С. 193–198